**Наталля Анофранка**

# Каталіцкае і ўніяцкае духавенства беларуска-літоўскіх губерняў у паўстанні 1830–1831 гг.

**Natallia Anofranka**

**Catholic and Uniate clergies of Belarusian-Lithuanian provinces in the uprising of 1830-1831.**

The participation of Catholic and Uniate clergy of Belarusian-Lithuanian provinces in anti-Russian uprising of 1830-1831 is considered. The special attention is paid to the activities of the Russian administration, which were directed at stopping the active participation of clergy of Catholic and Uniate confessions in insurgent movement.

*Keywords*: Catholic clergy, Uniate clergy, Belarusian-Lithuanian province, anti-government disturbance, the Russian administration, the Governor-General, the Commission of Inquiry, state criminal

**Наталія Анофранка**

**Католицьке і уніатське духовенство білорусько-литовських губерній в повстанні 1830–1831 рр.**

Розглядається участь католицького і уніатського духовенства білорусько-литовських губерній в антиросійському повстанні 1830–1831 рр. Особлива увага приділена заходам російської адміністрації, які були спрямовані на припинення активної участі духовенства католицької і уніатської конфесій в повстанському русі.

*Ключові слова:* католицьке духовенство, уніатське духовенство, білорусько-литовські губернії, антиурядові хвилювання, російська адміністрація, генерал-губернатор, слідча комісія, державний злочинець

Удзел каталіцкага і ўніяцкага духавенства беларуска-літоўскіх губерняў у паўстанні 1830–1831 гг., у той ці іншай ступені, знайшоў адлюстраванне як у айчыннай, так і ў замежнай гістарыяграфіі галоўным чынам у польскай). Польскімі даследчыкамі гэта праблема разглядалася фрагментарна, у сувязі з паўстаннем у Царстве Польскім. Адзначалася, што ў беларуска-літоўскіх губернях «польскі дух» быў слабейшы, а святарства і шляхта былі больш звязаны з расійскім дзяржаўным апаратам чым у Царстве Польскім[1]. Аднак гэта выснова не перашкаджала ідэалізацыі пазіцыі беларуска-літоўскага каталіцкага і ўніяцкага духавенства (ў тым ліку вышэйшага). Цэнтральнае ж месца займала апісанне дзеянняў канкрэтных духоўных асоб на баку паўстанцаў, высвятленне прычын удзелу духавенства ў антыўрадавых хваляваннях[2].

У беларускай гістарыяграфіі праблема ўдзелу духавенства ў паўстанні 1830–1831 гг. пачала распрацоўвацца з 90-х гг. XX ст. як у рамках канфесійнай (І. Ганчарук[3], А. Філатава[4]), так і ў рамках палітычнай гісторыі (В. Гарбачо-

ва[5], А. Карповіч[6], А. Радзюк[7]). У асноўным беларускія даследчыкі разглядалі прадстаўнікоў каталіцкага і ўніяцкага духавенства як актыўных удзельнікаў паўстання. У сувязі з гэтым вылучаліся прычыны, якія паўплывалі на ўцягванне ў паўстанне прадстаўнікоў сярэдняга і ніжэйшага каталіцкага і ўніяцкага духавенства: захаванне ідэалаў Рэчы Паспалітай, традыцыйнасць сістэмы адукацыі, прыналежнасці духавенства да вышэйшага саслоўя былой Рэчы Паспалітай, нежаданне губляць уплывовага палажэння каталіцкай царквы ў грамадстве беларуска-літоўскіх губерняў[8]. Таксама адзначаліся актыўныя формы ўдзелу духавества ў паўстанні[9]. Удзел каталіцкага кліру ў паўстанцкім руху ацэньваўся як актыўны і, адпаведна, добраахвотны[10]. У некаторых выпадках, нават больш актыўны, чым у Царстве Польскім[11]. Беларускія гісторыкі звярталіся і да колькаснага складу прадстаўнікоў духавенства, якія ўдзельнічалі ў паўстанні. В. Гарбачова прывяла звесткі па Гродзенскай, Мінскай і беларускім паветам Віленскай губерні. Паводле яе падлікаў усяго ў паўстанні ўдзельнічалі 122 асобы духоўнага звання – 101 католік (4,5% ад усіх паўстанца), 18 уніятаў (0,8% ад усіх паўстанцаў), 3 праваслаўных святары (0,1% ад усіх паўстанцаў). Духавенства Віцебскай і Магілёўскай губерняў у паўстанні не ўдзельнічала[12]. Па звестках А. Карповіча ў Віцебскай, Гродзенская, Мінскай губернях і ў беларускіх паветах Віленскай губерні ў паўстанні ўдзелнічала 162 прадстаўнікі духоўнага саслоўя – 36 католікаў, 25 уніятаў, 1 праваслаўны Ён падлічыў, што ад усяго каталіцкага духавенства Мінскай губерні колькасць тых, хто браў удзел у паўстанні (56 чалавек) склала ўсяго 13,8%[13].

Данныя беларускіх гісторыкаў паказваюць, што роля каталіцкага і ўніяцкага духавенства ў паўстанні 1830–1831 гг. была заўважнай, але падаўляючая большасць кліру ў паўстанні не ўдзельнічала. Акцэнтуючы ўвагу на паўстанцкай актыўнасці, у беларускай гістарыяграфіі каталіцкае і ўніяцкае духавенства не разглядалас як аб'ект палітычнага ўздзеяння як з боку расійскага ўрада і мясцовай адміністрацыі, так і з боку паўстанцаў. Меншае раскрыццё атрымалі меры стрымлівання, якія былі накіраваны на прадухіленне масавага ўдзелу каталіцкіх і ўніяцкіх святароў у паўстанцкім руху ў беларуска-літоўскіх.

Адной з прычын адмаўлення каталіцкага і ўніяцкага духавенства ад падтрымкі і ўдзелу ў антыўрадавых хваляваннях 1830–1831 гг. у беларуска-літоўскіх губернях было перакананне ў недапушчальнасці для хрысціян узброенай барацьбы. Такую пазіцыю да паўстання 1830–1831 гг. у Царстве Польскім заняў і Ватыкан. Урад Расійскай імперыі праз дыпламатычныя каналы вёў перамовы з Апостальскай Сталіцай, каб Пантыфік афіцыйна асудзіў антырасійскае паўстанне. Папскі зварот да арцыбіскупа Варшаўскага і іншых біскупаў быў падрыхтаваны 15 лютага 1831 г. У ім гаварылася, што вышэйшае духавенства абавязана прытрымлівацца капланскіх абавязкаў і не

ўмешвацца ў справы, якія парушаюць грамадскі супакой. Святары павінны займацца пытаннямі рэлігіі і пабожнасці прыхаджан, вучыць вернікаў шанаваць і праяўляць паслухмянасць да дзяржаўнай улады[14].

Яшчэ раней за папскі зварот ад 15 лютага 1831 г. вышэйшае каталіцкае і ўніяцкае духавенства Расійскай імперыі асудзіла паўстанне ў Царстве Польскім. 16 снежня 1830 г. на рускай і польскай мове быў апублікаваны пастарскі ліст уніяцкага мітрапаліта І. Булгака, у якім асуджалася няўдзячнасць польскага народа. Мітрапаліт пісаў: *«несколько людей без веры и чести, подвизавшихся в ужасах Французской революции; несколько честолюбцев все приносящих в жертву своему высокомерию; несколько легкомысленных юношей, ни причин, «ни последствий не запоминающих; несколько расточителей, надеющихся в общих бедствиях спасти себя от конечного разорения, вооружив чернь варшавскую, присвоив права законной власти, страхом и злыми наветами, влекут соплеменный нам польский народ к погибели и посрамлению»*. Звяртаючыся да духавенства, мітрапаліт выказваў спадзяванне, што ўніяцкая царква не будзе *«осквернена хотя одним изменником и клятвопреступником»*. Вернікаў ён заклікаў да цішыні і супакою[15]. З аналагічнымі па змесце пастарскімі лістамі звярнуліся і каталіцкія біскупы[16]. Пазіцыя вышэйшага каталіцкага і ўніяцкага духавенства цалкам адпавядала той ролі, якую яны павінны былі выконваць у сістэме кіравання Расійскай імперыі – прадухіленне падтрымкі паўстання сярэднім і ніжэйшым духавенствам і супакаенне вернікаў.

Нягледзячы на антыпаўстанцкую пазіцыю кіраўнікоў уніяцкай і каталіцкай цэркваў, расійскі ўрад з недаверам паставіўся да сярэдняга і ніжэйшага духавенства гэтых канфесій у беларуска-літоўскіх губернях. На іх былі распаўсюджаны меры стрымлівання, якія датычыліся ўсяго насельніцтва краю. Так, святары і манахі, як і астатнія жыхары, са снежня 1830 г. павінны былі здаць стрэльбы для палявання і іншую зброю[17]. За ўтойванне зброі святары прыцягваліся да адказнасці як і астатняе насельніцтва[18]. Таксама былі ўведзены меры, якія датычыліся непасрэдна каталіцкага і ўніяцкага духавенства.

Расійскую адміністрацыю непакоіла тое, што пад выглядам манахаў па беларуска-літоўскіх губернях маглі перамяшчацца паўстанцы[19]. У сакавіку 1831 г. быў выдадзены загад, які забараняў манахам пакідаць манастыры і перамяшчацца з адной епархіі ў іншую без дазволу епархіяльнага начальства і атрымання адпаведнага дакумента ад губернскай адміністрацыі[20]. (яшчэ раз пацверджаны ў маі 1831 г.[21]). Нагляд за выкананнем гэтага распараджэння ўскладаўся на манастырскіх начальнікаў. Пры падазронай адсутнасці манаха, яны былі абавязаны неадкладна паставіць у вядомасць паліцыю і губернскую адміністрацыю. Далей справай падазронага манага займалася паліцыя і следчая камісія[22].

Павятовыя і губернскія органы ўлады таксама адсочвалі перамяшчэнне манахаў. Пад асаблівую ўвагу патрапілі манахі розных ордэнаў, якія займаліся зборам ахвяраванняў. Паліцыя падазравала, што гэта паўстанцы, прыкрываючыся манаскім адзеннем, у розных населеных пунктах падбухторвалі жыхароў да беспарадкаў[23]. Калі манах перамяшчаўся *«без надлежащих позволений епархиального начальства и должного паспорта»* [24], спагнанні датычыліся як манаха, так і манастырскае начальсьства, якое не выдала адпаведных дакументаў[25].

Для прадухілення ўкрывальніцтва паўстанцаў у шматлікіх каталіцкіх і ўніяцкіх манастырах беларуска-літоўскіх губерняў з «24 красавіка 1831 г. манастырскае кіраўніцтва абавязвалася неадкладна падаваць звесткі ў мясцовую паліцыю пра свецкіх асоб, якія прыязджалі ў манастыр. Таксама даваліся тлумачэнні, на якіх падставах свецкай асобе дазволена спыніцца ці пражываць у манастыры. За невыкананне гэтых распараджэнняў (не кажучы пра наўмыснае ўкрывальніцтва паўстанцаў у манастырах), начальнікам каталіцкіх і ўніяцкіх манастрыоў пагражала пакаранне[26]. Для больш эфектыўнага кантролю за манахамі і выяўлення падазроных асоб, якія з'яўляліся ў манастырах Віцебскі генерал-губернатар М. Хаванскі вясной 1831 г. запатрабаваў ад кіраўнікоў рымска-каталіцкіх і ўніяцкіх епархій спісы ўсіх духоўных асоб і манастырскай прыслугі[27]. 1 мая 1831 г. Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя падала спісы манахаў і прыслугі па 20 мужчынскім манастырам Віцебскай і 28 мужчынскім манастырам Магілёўскай губерні. Агульны спіс па дзвюм губерням налічваў 400 чалавек[28]. 8 мая 1831 г. такія ж звесткі былі пададзены па манастырах базыліянскага ордэну ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, агульны спіс утрымліваў звесткі пра 91 асобу[29].

Тым не менш, нягледзячы на абмежавальныя і рэпрэсіўныя меры, якія былі ўведзены на тэрыторыі беларусака-літоўскіх губерняў вясной 1831 г., частка святароў тым ці іншым чынам удзельнічала ў паўстанні, ці падазравалася ў датычнасці да яго. У сувязі з гэтым летам 1831 г. паўстала праблема падсуднасці людзей духоўнага звання, якія падазраваліся ва ўдзеле ў антыўрадавых хваляваннях. 26 чэрвеня 1831 г. генерал-губернатар М. Хаванскі атрымаў імператарскае распараджэнне, ў якім гаварылася, што *«со всеми лицами духовного ведомства, принимавших участие в мятеже поступать на равне с людьми других сословий по высочайшему указу 22 марта 1831 г.»*[30]. Імператарскі ўказ ад 22 сакавіка 1831 г. дакладна вызначаў ступень адказнасці і меры пакарання за ўдзел у антырасійскіх хваляваннях[31]. У верасні 1831 г. імператар яшчэ раз пацвердзіў, што да ўсіх асобаў духоўнага звання, якія бралі ўдзел у антыўрадавых хваляваннях, неабходна прымяняць такія ж меры пакарання як да прадстаўнікоў іншых саслоўяў[32]. За кансісторыямі заставалася права судзіць прадстаўнікоў духавенства за ўсялякія справы, акрамя мяцежных і крымінальных. Гэта распараджэнне

было абвешчана ўсяму духавенству праз рымска-каталіцкую і грэка-ўніяцкую духоўныя калегіі[33]. Такім чынам, прадстаўнікі духавенства ўраўноўваліся ў адказнасці за дзяржаўныя злачынствы з прадстаўнікамі іншых саслоўяў і замест духоўнага адразу пераходзілі ў юрысдыкцыю грамадзянскага суда.

Кантроль за перамяшчэннем манахаў па паветах беларуска-літоўскіх губерняў, а таксама ўлік манахаў па манастырах і персанальная адказнасць манастырскага начальства, змены ў судаводстве ў адносінах да прадстаўнікоў духоўнага звання паўплывалі на асноўную частку каталіцкага і ўніяцкага духавенства, якая дыстанцыявалася ад паўстанцкага руху і працягвала сваю звычайную дзейнасць.

Увядзенне надзвычайных мер у беларуска-літоўскіх губернях спрыяла ўсталяванні ў краі атмасферы падазронасці і стымулявала данасіцельства з боку мясцовага насельніцтва, у тым ліку і ў адносінах да духавенства[34]. Мноства даносаў былі фальшывымі, што выяўлялася ў час следства як губернскай адміністрацыяй, так і следчай камісіяй[35]. Аднак, пры адсутнасці доказаў, не са ўсіх святароў здымалася падазрэнне ў антыўрадавых, антырасійскіх настроях. За імі ўсталёўваўся паліцэйскі нагляд, які мог працягвацца і пасля падаўлення паўстання[36].

Пры наяўнасці фальшывых абвінавачванняў былі і даказаныя ўзаемадачыненні прадстаўнікоў каталіцкага ды ўніяцкага духавенства з паўстанцкім рухам. У першую чаргу вылучаецца агітацыйная дзейнасць сярод насельніцтва, абвяшчэнне паўстанцкіх дакументаў у парафіях і агучванне распараджэнняў паўстанцкіх улад[37]. Формы ўдзелу каталіцкіх і ўніяцкіх святароў у паўстанні часта камбінаваліся. Агітацыя магла спалучацца і з іншымі дзеяннямі. Напрыклад, завілейскі каталіцкі святар К. Каверскі чытаў з амбону паўстанцкія пракламацыі, а таксама па загадзе паўстанцаў даў са свайго маёнтка 8 кантаністаў[38]. У Глыбокім святары не толькі агітавалі за паўстанне, але і вучылі сялян карыстацца рознай зброяй[39]. Манах магілёўскага бернардзінскага манастыра Дробыш абвінавачваўся не толькі ў антыўрадавай агітацыі сярод насельніцтва, але і ў шпіянажы на карысць паўстанцаў[40]. Распаўсюджанай формай было прывядзенне да прысягі на адданасць паўстанцкаму ўраду[41]. Таксама святары аказвалі паўстанцам дапамогу ў выглядзе грашовых ахвяраванняў, збіралі для іх зброю, харчаванне, амуніцыю[42].

Дакументы следства паказываюць, што дапамога каталіцкіх і ўніяцкіх святароў паўстанцам не заўсёды былі свядомымі і насілі добраахвотны характар. Нярэдка яны былі вымушаныя ў ваенна-палітычных абставінах ці былі вынікам адкрытага прымусу з боку паўстанцаў. Калі следчая камісія высвятляла, што прадстаўнікі духавенства дапамагалі паўстанцам не па сваёй волі, а пад ціскам і прымусам, іх віна прызнавалася нязначнай, абвінавачванні здымаліся і яны вызваляліся ад суду[43].

Актыўныя формы ўдзелу каталіцкага і ўніяцкага духавенства ў паўстанні былі свядомыя і насілі добраахвотныя характар. Да іх адносілася знаходжанне святароў у паўстанцкіх атрадах у якасці капеланаў[44]. Пакаранне за выкананне функцый капеланаў у паўстанцкіх атрадах было дастаткова суровае – пазбаўленне царкоўнага сану і высылка на пасяленне ў Сібір[45]. Часам, знаходзячыся ў паўстанцкіх атрадах, прадстаўнікі каталіцкага духавенства ўдзельнічалі ў паўстанні са зброяй у руках[46]. Былі выпадкі, калі прадстаўнікі духавенства праяўлялі ініцыятыву і ўдзельнічалі ў арганізацыі ўзброенай барацьбы. Напрыклад, прэлат радашковіцкага касцёла Ш. Паразінскі прысягнуў паўстанцкаму ўраду сам, прывёў да прысягі жыхароў і ўзначаліў у Радашковічах «мяцежныя дзеянні»[47]. У Завілейскім павеце настаяцель Мыхтунскага каталіцкага прыхода В. Завадскі быў членам створанага паўстанцамі завілейскага ўрадавага камітэта, дзе ўзначальваў паліцэйскую і распарадчую часткі[48]. Святар піярскага манастыра ў Лужках А. Татур браў удзел у дзейнасці камітэта канфедэрацыі, дзе выконваў абавязкі сакратара па грамадзянскай частцы. Следчай камісіяй А. Татур быў палічаны зачыншчыкам і кіраўніком антыўрадавых выступленняў, залічаны да першага разраду дзяржаўных злачынцаў, што прадугледжвала смяротнае пакаранне. Аднак, з-за таго, што добраахвотна з'явіўся з пакаяннем да Магілёўскага грамадзянскага губернатара М. Мураўёва, яму было даравана імператарскае прабачэнне[49]. Часам святары, якія ўключаліся ў паўстанцкі рух прымянялі гвалт і прымус. Вікарый Радашковіцкага касцёла Ш. Вайткевіч быў кіраўніком антыўрадавых выступленняў у мястэчку Радашковічы, раздаваў народу зброю, заклікаючы яго да паўстання, пры гэтым яго дзеянні насілі гвалтоўны характар[50]. Вікарый Ш. Вайткевіч напаў на паштовую станцыю, узяў у палон паліцмайстра Галіеўскага, пад прымусам яго і двух ягоных сыноў адвёз яго ў Вілейку, дзе запісаў іх у паўстанцкі атрад[51].

Такім чынам, з пачаткам паўстання ў Царстве Польскім, у беларуска-літоўскіх губернях расійскі ўрад пачаў уводзіць дастаткова эфектыўныя меры па прадухіленні ўдзелу каталіцкага і ўніяцкага духавенства ў антырасійскіх хваляваннях. У паўстанцкі рух была ўцягнута дастаткова нявялікая частка каталіцкага і ўніяцкага кліру. Формы ўдзелу каталіцкага і ўніяцкага духавенства ў паўстанні былі разнастайныя – агітацыя сярод насельніцтва, малебны ў гонар паўстанцаў, прывядзенне да прысягі, збор і выраблення зброі, папаўненне паўстанцкіх атрадаў кантаністамі са сваіх маёнткаў, выдзяленне грашовых сродкаў і г.д. Аднак незаўсёды такая падтрымка паўстанцаў з боку духавенства насіла свядомы і добраахвотны характар. Гэта акалічнасць улічвалася следчымі органамі, і з часткі святароў абвінавачанні былі знятыя. У той жа час актыўныя формы ўдзелу ў паўстанні (выкананне функцый капеланаў у паўстанцкіх атрадах, удзел ва ўзброенай барацьбе, удзел у дзейнасці паўстанцкіх

камітэтаў) былі асэнсаваныя і добраахвотныя. За такія дзеянні прадстаўнікі духавенства пазбаўляліся сану, залічваліся да першага ці другога разраду дзяржаўных злачынцаў і неслі пакаранне ад усталявання паліцэйскага нагляду да пазбаўлення волі і высылкі ў Сібір на пасяленне.

1 Żywzcyński M. Watykan wobec powstania listopadowogo. / M. Żywzcyński. – Kraków: Universitas, 1995. – S. 45.

2 Żywzcyński M. Watykan wobec powstania listopadowogo. – S. 45–52; Dylągowa H. Duchiwieństwo katolickie wobec sprawy narodowej (1764 – 1864). / H. Dylągowa. – Lublin: Wydawnictwo Towarzystwa Naukowego KUL, 1983. – S. 89–94.

3 Ганчарук І. Г. Да пытання аб ролі каталіцкай царквы ў вызваленчым руху Беларусі ў XIX ст. / І. Г. Ганчарук // Наш радавод. Царква і культура народаў Вялікага княства Літоўскага і Беларусі XVIII – пач. XX стст. (Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гродна, 28 верасня – 1 кастрычніка) 1992 г. – Кн. 4 (частка 3). – Гродна, 1992. – С. 633–642.

4 Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772 – 1860 гг. / Е.Н. Филатова. – Мн.: Бел. Наука, 2006. – 192 с.

5 Гарбачова В. В. Паўстанне 1830–1831 гадоў на Беларусі. / В. В. Гарбачова; [Навук. рэд. У.А.Сосна]. – Мн. : Бел. дзярж. ун-т, 2001. – 184 с.

6 Карпович, О. В. Участие христианского духовенства Беларуси в освободительном движении 30-х годов XIX века. / О. В. Карпович // Вестник Полоцкого государственного университета. – Новополоцк: Полоцкий государствееный университет, 2011. – № 9 (серия «гуманитарные науки»). – С. 63–67.

7 Радзюк А. Р. Удзел духавенства ў нацыянальна-вызваленчым руху 30-х гг. XIX ст. на Беларусі. / А. Р. Радзюк // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа : зб. навук. арт. : у 2 ч. Ч. 1 / ГрДУ імя Я. Купалы; рэдкал.: С.В. Марозава [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 219–223.

8 Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772 – 1860 гг. – С. 82.

9 Гарбачова В. В. Паўстанне 1830–1831 гадоў на Беларусі. – С. 136–138; Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772 – 1860 гг. – С. 8; Радзюк А. Р. Удзел духавенства ў нацыянальна-вызваленчым руху 30-х гг. XIX ст. на Беларусі. – С. 219–221.

10 Ганчарук І. Г. Да пытання аб ролі каталіцкай царквы ў вызваленчым руху Беларусі ў XIX ст. – С. 634; Гарбачова В. В. Паўстанне 1830–1831 гадоў на Беларусі. – С. 136; Карпович О.В. Участие христианского духовенства Беларуси в освободительном движении 30-х годов XIX века. – С. 63.

11 Радзюк А. Р. Удзел духавенства ў нацыянальна-вызваленчым руху 30-х гг. XIX ст. на Беларусі. – С. 221.

12 Гарбачова В. В. Паўстанне 1830–1831 гадоў на Беларусі. – С. 127.

13 Карпович О. В. Участие христианского духовенства Беларуси в освободительном движении 30-х годов XIX века. – С. 64.

14 Ганчарук І. Г. Да пытання аб ролі каталіцкай царквы ў вызваленчым руху Беларусі ў XIX ст. – С. 634; Żywzcyński M. Watykan wobec powstania listopadowogo. – S. 12–16.

[15] НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 2788. Обращение митрополита Греко-униатской церкви И. Булгака. (20 января 1831 г.). – Арк. 2–2 адв.

[16] Żywzcyński M. Watykan wobec powstania listopadowogo. – S. 45–47

[17] НГАБ. – Ф. 1297. – Воп. 1. – Спр. 6121. Дело о возвращении помещикам Рогачевского уезда и ксензам изъятого оружия (1833); НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 2738. Дело по распоряжению дрисенского городничего о выполнении им требования по розыску оружия. (май-июнь 1831).

[18] Тамсама. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 3. Алфавитный список всех лиц о коих производилась переписка в Минской губернской комиссии высочайше утвержденной по делам о бывшем в 1831 году мятеже. Часть вторая. (К.-П.). – Арк. 105; НГАБ. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 5. Копия алфавитного списка всех лиц коих производилась переписка в Минской губернской комиссии высочайше утвержденной по делам объявившим в 1831 г. мятеж. (Р.-Я.). – Арк. 69 адв.

[19] Тамсама. – Ф. 1297. – Воп. 1. – Спр. 5484. Дело по отношению управляющего МВД о воспрещении перевоза римско-католических монахов из одной губернии в другую без сведений начальников губерний (май 1831 – сентябрь 1832). – Арк. 1–1 адв.

[20] Тамсама. – Арк. 4 адв.

[21] Тамсама. – Арк. 1.

[22] Тамсама. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 151.

[23] Тамсама. – Ф. 1297. – Воп. 1. – Спр. 5484. Дело по отношению управляющего МВД о воспрещении перевоза римско-католических монахов из одной губернии в другую без сведений начальников губерний (май 1831 – сентябрь 1832). – Арк. 4.

[24] Тамсама. – Ф. 1297. – Воп.1 – Спр. 5475. Дело по донесению генерал-майора Данилова о доставлении сведений о взятом в динабургском уезде Бернардинского монастырского ксенза Есмана о найденном при нем оружии. (1831). – Арк. 9.

[25] Тамсама. – Арк. 9.

[26] Тамсама. – Фонд 1297. – Воп. 1. – Спр. 5532. Дело о воспрещении продерживать в кляшторах и монастырях не принадлежащих к ним людей без разрешения полиции (нач. 24 апр. 1831 – оконченр 19 июня 1831 г.). – Арк. 1–2 адв., 25–25 адв.

[27] Тамсама. – Арк. 2 адв.

[28] Тамсама. – Арк. 7–18.

[29] Тамсама. – Арк. 19–22 адв.

[30] Тамсама. – Ф. 1297. – Воп. 1. – Спр. 5581. Дело по рапорту начальника штаба военных поселений о принятии мер ко всем лицам духовного ведомства, принимавших участие в восстании на равнее с лицами других сословий. – Арк. 1.

[31] Полное собрание законов Российской импери (1825 – 1881). – Т. 6. – № 4444. // О бунте, прошедшем в трёх уездах Виленской губернии, и о суждении всех дворян и шляхту, принявших участие в сем бунте, военным уголовным судом по Полевому уголовному уложению.

[32] НГАБ. – Ф. 1430. – Воп. 1. – Спр. 2803. Дело о принятии мер наказания к духовным лицам, принимающим участие в польском восстании (9 сентября 1931). – Арк. 3 адв.

[33] Тамсама. – Арк. 2–2 адв., 3 адв.

[34] Тамсама. – Ф. 1297. – Воп. 1. – Спр. 5240. Дело о доставке сведений относительно действий повстанческих отрядов в белорусских губерниях. – Арк. 42-43 адв., 370–

372; Тамсама. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 2803. Дело о принятии мер наказания к духовным лицам, принимающим участие в польском восстании (9 сентября 1931). – 2–2 адв.

35 Тамсама. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 2. Алфавитный список лиц, учавствовавших в польском восстании 1831 г. (А.- Г.). – Арк. 8 адв., 27 адв.; НГАБ. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 1, 8, 79; НГАБ. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 5. – Арк. . 40 адв., 83.

36 Тамсама. – Ф. 1297. – Воп.1. – Спр. 5479. Дело о доставлении сведений о шляхтиче Короле, ксензах Колуше, Лавдинском, Каминионке (1831 26 апреля – 23 мая). – Арк. 2, 5, 17, 21; Тамсама. – Ф. 1297. – Воп. 1. – Спр. 5474. Дело о доставлении сведений о неблагонадежности прелата Озерского монастыря Бегляра.(22 июля 1831 – 5 июня 1837 г.). – Арк. 14 адв., 24.

37 Ганчарук І. Г. Да пытання аб ролі каталіцкай царквы ў вызваленчым руху Беларусі ў XIX ст. – С. 635; Гарбачова В. В. Паўстанне 1830-1831 гадоў на Беларусі. – С. 136; НГАБ. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 105; Тамсама. – Фонд 561. – Воп. 1. – Спр. 5. – Арк. 127.

38 Тамсама. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 32.

39 Тамсама. – Ф. 1297. – Воп. 1. – Спр. 5240. – Арк. 117 адв.

40 Тамсама. – Спр. 5453 Дело о заключении монаха Попеля в полоцкий монастырь под строгий надзор за доставку сведений повстанцам (1831 – 1832). – Арк. 1.

41 Гарбачова В.В. Паўстанне 1830-1831 гадоў на Беларусі. – С. 136–137.

42 НГАБ. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 183; Гарбачова В.В. Паўстанне 1830-1831 гадоў на Беларусі. – С. 136–137.

43 Тамсама. – Спр. 2. – Арк. 2, 28, 104 адв.; Тамсама. – Спр. 5. – Арк. 46.

44 Тамсама. – Арк. 85, 86, 117.

45 Тамсама. – Арк. 132, 148.

46 Гарбачова В. В. Паўстанне 1830-1831 гадоў на Беларусі. – С. 136; НГАБ. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 104; Спр. 3. – Арк. 16.

47 НГАБ. – Ф. 561. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 189.

48 Тамсама. – Спр. 2. – Арк. 145.

49 Тамсама. – Спр. 5. – Арк. 77 адв.

50 Гарбачова В. В. Паўстанне 1830–1831 гадоў на Беларусі. – С. 136.

51 Тамсама. – Спр. 2. – Арк. 60–61.